View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"

Кафедра гісторыі Беларусі

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ
# (АД СТАРАЖЫТНЫХ ЧАСОЎ ДА КАСТРЫЧНІКА 1917 ГОДА)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Матэрыялы Рэспубліканскай*
*навукова-тэарэтычнай канферэнцыі*
г. Мінск, 28 сакавіка 2008 г.

Мінск, 2008

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

Рэдкалегія:

першы прарэктар БДПУ, старшыня арганізацыйнага камітэта канферэнцыі *А.І. Андарала*;

кандыдат педагагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі БДПУ *І.І. Багдановіч*;

кандыдат гістарычных навук, дацэнт *І.В. Варывончык*;

доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *А.П. Жытко*;

доктар гістарычных навук, прафесар, дэкан гістарычнага факультэта БДПУ *М.М. Забаўскі*;

кандыдат гістарычных навук, старшы выкладчык *З.І. Канапацкая*;

доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры новай і навейшай гісторыі БДПУ *Г.А. Космач*;

доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Беларусі БДПУ *А.М. Люты*;

доктар гістарычных навук, дацэнт *М.І. Мініцкі*;

начальнік вучэбна-выдавецкага цэнтра БДПУ *В.Я. Навагродскі*;

доктар гістарычных навук, прафесар *В.А. Пілецкі* (адк. рэд.);

кандыдат гістарычных навук, дацэнт *А.Ф. Рацько*;

доктар гістарычных навук, прафесар *М.К. Сакалоў*;

кандыдат гістарычных навук, дацэнт *М.М. Сакалоў*;

кандыдат гістарычных навук, дацэнт *А.Г. Субоцін*;

доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі старажытных цывілізацый і сярэдневякоўя БДПУ *У.В. Тугай*;

кандыдат гістарычных навук, дацэнт *П.А. Тупік*;

доктар гістарычных навук, прафесар *В.М. Фамін*;

доктар гістарычных навук, прафесар *І.Р. Чыкалава*;

кандыдат гістарычных навук, дацэнт *Л.Л. Шкуцько*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## МЯСЦОВАЕ СЯЛЯНСКАЕ САМАКІРАВАННЕ Ў БЕЛАРУСІ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIX – ПАЧАТАК XX СТ.) У ГІСТАРЫЯГРАФІІ

С.А. Талмачова, г. Мінск

Дзейнасць органаў сялянскага самакіравання з часу свайго юрыдычнага афармлення прыцягвала ўвагу розных колаў грамадства. Акцэнты ў асвятленні тых ці іншых бакоў самакіравання рабіліся ў залежнасці ад грамадска-палітычных поглядаў даследчыкаў.

У XIX – пачатку XX ст. у Расійскай імперыі існавалі некалькі тэорый мясцовага самакіравання. Адной з найбольш ранніх была тэорыя вольнай абшчыны, распрацаваная нямецкім юрыстам і філосафам Г.Арэнсам. Яна разглядала грамадскую ўладу ў якасці чацвёртай улады і не дапушчала ніякага ўмяшальніцтва дзяржавы ў грамадскія справы. Абшчына прызнавалася “дзяржавай у дзяржаве”, а яе службовыя асобы – агентамі грамадства, але не дзяржавы. Гаспадарчая тэорыя, прыхільнікам якой быў вядомы грамадскі дзеяч кн. А.І.Васільчыкаў, таксама вызначала незалежнасць абшчыны ад дзяржавы. У адпаведнасці з ёю самакіраванне – гэта вырашэнне гаспадарчых спраў мясцовага характару, а не спраў дзяржаўнага кіравання. Сутнасць палітычнай тэорыі, якую падтрымлівалі многія дзеячы пачатку XX ст. у Расіі, заключалася ў супрацьпастаўленні “земшчыны” (грамадскага пачатку) і “апрычніны” (урадава-бюракратычнаму пачатку). Усе гэтыя тэорыі супрацьпастаўлялі грамадскі пачатак дзяржаўнаму, а пад самакіраваннем разумелі арганізацыю, вольную ад кантроля дзяржавы [1, с. 25–26]. Прыхільнікі дзяржаўнай тэорыі (В.П.Безабразаў, А.Д. Градоўскі ды інш.) адзначалі, што самакіраванне – гэта ўскладанне на мясцовае грамадства вырашэння задач дзяржаўнага кіравання. Дзяржава перадае мясцовыя справы грамадскім установам, але захоўвае шчыльны кантроль за дзейнасцю мясцовых органаў самакіравання. Блізкай па сэнсе да дзяржаўнай прымыкае юрыдычная тэорыя (М.М.Каркуноў), у адпаведнасці з якой органы самакіравання прызнаваліся органамі мясцовай абшчыны, якія выконвалі функцыі дзяржаўнага кіравання [1, с. 25–26].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Такія розныя падыходы абумовілі і акцэнты, якія ставілі тыя ці іншыя дзеячы ў сваіх выказваннях наконт мясцовага самакіравання ў цэлым. Асабліва складанай у гэтым сэнсе з’яўлялася праблема сялянскага самакіравання. І калі ў цэлым у імперыі гэтыя праблемы цікавілі многіх грамадзян, то саслоўнае сялянскае самакіраванне ў парэформеннай Расіі на беларускіх землях сур’ёзна не даследавалася вучонымі, але атрымала адназначную, галоўным чынам, адмоўную ацэнку ў публіцыстычнай і навуковай літаратуры. У адных выпадках гэта было звязана з эмацыянальным адмаўленнем заганаў сялянскага жыцця і недахопаў механізмаў самакіравання. Такі падыход праявіўся галоўным чынам у дарэвалюцыйным друку. У савецкай гістарыяграфіі панаваў другі галоўны пастулат, які зводзіўся да таго, што сялянства было пасіўным аб’ектам

заканадаўства 1861 г. і сродкам у руках самадзяржаўя, якое поўнасцю падпарадкавала абшчыну сваім фіскальным і палітычным інтарэсам.

Сялянскае самакіраванне ў другой палове XIX – пачатку XX ст. прыцягвала ўвагу сучаснікаў рэформы. У.П.Безабразаў, А.І.Васільчікаў, А.І.Кошалеў, К.К.Сцефановіч, А.Арапаў, М.М.Катаеў, А.І.Мілавідаў ды інш. разглядалі асобныя бакі дзейнасці органаў сялянскага самакіравання. Публікацыі аб’ядноўваліся думкай аб неабходнасці рэфармавання ўсіх мясцовых устаноў і перш за ўсё сялянскіх. Некаторыя з аўтараў сканцэнтравалі ўвагу на ідэі шкоднасці для сялян залішняй апекі з боку мясцовай адміністрацыі, а іншыя, наадварот, лічылі, што апека была недастатковай. К.К.Сцефановіч, А.Арапаў, А.І.Мілавідаў указвалі, што ў Паўночна-Заходнім краі неабходна ўвядзенне моцнай улады, якая б кіравала дзейнасцю органаў сялянскага самакіравання. Гэтыя публікацыі змяшчаюць значны фактычны матэрыял, аднак носяць галоўным чынам публіцыстычны характар [2].

Выказванні У.І.Леніна аб абшчыне аказалі моцны ўплыў на пазнейшую гістарыяграфію. У савецкай гістарыяграфіі пераважаў погляд на парэформенную абшчыну як на дадатак фіскальнага апарату самадзяржаўнай манархіі. У расійскай савецкай гістарыяграфіі шмат работ, якія асвятляюць дзейнасць органаў сялянскага самакіравання асобных рэгіёнаў. Многія публікацыі былі прысвечаны ўвогуле расійскай вёсцы. Сярод іх можна вылучыць працы Н.М.Дружыніна, С.М.Сідзельнікава, В.А.Аляксандрава, Л.В.Данілавай, П.А.Зайанчкоўскага ды інш. Усе яны напісаны на падставе марксісцка-ленінскай метадалогіі і класавага падыходу, таму захоўваюць схільнасць да палітызацыі праблемы. Увогуле ў савецкай гістарыяграфіі роля сялянскага самакіравання прыніжалася. Галоўным было палажэнне, што ў самадзяржаўнай Расіі рэальнага самакіравання не магло быць. А між іншым, царская адміністрацыя надавала важнае значэнне сялянскаму самакіраванню, асабліва ў Паўночна-Заходнім краі, каб нейтралізаваць уплыў дваранства рымска-каталіцкага веравызнання.

У работах беларускіх савецкіх гісторыкаў М.Б.Фрыдман і Л.П.Ліпінскага ўказвалася, што органы сялянскага самакіравання мелі фіскальны характар, гаварылася аб поўнай залежнасці выбарных сялянскіх устаноў ад мясцовага дваранства. Разам з тым, насуперак гэтым сцвярджэнням, прыводзіцца шмат фактаў, якія са станоўчага боку раскрываюць рэалізацыю органамі сялянскага самакіравання фінансава-падатковай, прадстаўнічай, вытворчай функцый, а таксама некаторых іншых [3]. Аграрныя адносіны ў Беларусі знайшлі адлюстраванне ў працах М.В.Доўнар-Запольскага, М.М.Улашчыка, Х.Ю.Бейлькіна, А.І.Кажушкова ды інш. У іх раскрываюцца і асобныя аспекты дзейнасці органаў сялянскага самакіравання.

Значны ўклад ў распрацоўку азначанай праблемы ўнёс В.П.Панюціч. У шматлікіх публікацыях, прысвечаных парэформеннай вёсцы, ім раскрываюцца многія бакі жыцця сялянства, у тым ліку дзейнасці абшчыны [4].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пытанне аб дзейнасці сялянскай абшчыны ўзнімалася ў “Гісторыі Беларусі” ў 5 тамах, якая пабачыла свет у 70-я гг. XX ст. Асабліва актыўна сталі вывучацца і пераглядацца многія пытанні аграрных адносін XIX–XX стст. у гады існавання Рэспублікі Беларусь. Асобныя пытанні азначанай тэмы разглядаюцца ў працах гісторыкаў А.П.Жытко, М.М.Забаўскага, У.П.Крука, З.В.Шыбекі, К.І.Шабуні, Л.П.Ліпінскага, У.С.Пуціка, ды інш. Аб цікавасці сучасных беларускіх даследчыкаў да пытанняў так званай аграрнай гісторыі сведчыць і выданне ў 2002 г. Інстытутам гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі фундаментальнай калектыўнай працы “Гісторыя сялянства Беларусі”, у якой асвятляюцца многія аспекты дзяржаўнай палітыкі парэформеннага перыяду ў адносінах да сялянства [5]. Вялікая ўвага да гісторыі расійскага і беларускага сялянства назіраецца і ў сучаснай замежнай гістарыяграфіі.

Справы ў вёсцы парэформеннага перыяду цікавілі ўрадавыя органы. З гэтай прычыны ствараліся шматлікія камісіі, напрыклад, так званая “Валуеўская” (па прозвішчы міністра ўнутраных спраў П.А.Валуева), якая даследавала становішча сельскай гаспадаркі Еўрапейскай Расіі ў пачатку 70-х гг. XIX ст. Значнае месца ў вывучэнні дзейнасці сялянскага самакіравання займаюць “Працы мясцовых камітэтаў аб патрэбах сельскагаспадарчай прамысловасці”. Выдаваліся заканадаўчыя акты і ўрадавыя пастановы, а таксама цыркулярныя распараджэнні адміністрацыі беларускіх губерняў у дачыненні да ўладкавання і дзейнасці органаў сялянскага самакіравання. Названыя дакументы сведчаць аб асаблівым стане 5 беларускіх губерняў у сувязі з вызваленчым рухам другой паловы XIX ст.

У дарэвалюцыйных перыядычных выданнях таксама адлюстроўваліся працэсы, што адбываліся ў вёсцы. Многія з публікацый носяць тэндэнцыйную афарбоўку, аднак адлюстроўваюць тыя грамадска-палітычныя працэсы, што адбываліся ў краі.

Такім чынам, нягледзячы на тое, што многія даследчыкі звярталіся да праблемы дзейнасці органаў сялянскага самакіравання, поўнага і шматбаковага асвятлення гэтая праблема не атрымала. Пры гэтым гісторыя вывучэння сялянскага “міра” ў цяперашні час ставіць больш пытанняў, чым адказаў, пошук якіх магчымы толькі з выкарыстаннем новых крыніц.

Літаратура

1. Писарькова, Л.Ф. Развитие местного самоуправления в России до Великих реформ. История изучения темы и эволюция основных понятий / Л.Ф.Писарькова // Земское самоуправление в России, 1864–1918: в 2 кн. / [отв. ред. Н.Г.Королева]; Ин-т рос. истории РАН. – Москва: Наука, 2005. – Кн. 1: 1864–1905. – 428 с.

2. Стефанович, К. О сельском и волостном управлении в Северо-Западном крае / К.Стефанович. – СПб.: Тип-я Глазунова, 1895. – 207 с.; Арапов, А.В. Краткий исторический очерк крестьянского вопроса и деятельности крестьянских учреждений Витебской губернии со дня обнародования Высочайшего Манифеста 19 февраля 1861 г. и до наших дней (50-летие) / А.В.Арапов. – Витебск: Губернская типография, 1911. – 62 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Липинский, Л.П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (вторая половина XIX века) / Л.П. Липинский. – Минск: Наука и техника, 1971. – 254 с.; Фридман, М.Б. Отмена крепостного права в Белоруссии / М.Б.Фридман. – Минск: Изд-во Белорус. ун-та, 1958. – 202 с.
4. Панютич, В.П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг. / В.П.Панютич. [научн. ред. П.Г.Козловский]. – Минск: Навука і тэхніка, 1990. – 375 с.; ён жа. Земскія, грамадскія і іншыя падаткі, павіннасці і плацяжы сялян Беларусі ў 60–90-я гады XIX ст. / В.П.Панюціч // Весці НАН Беларусі. – Сер. гуманіт. навук. – 2000. – № 3. – С. 71–75. ды іншыя публікацыі.
5. Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён: у 3 т. Т. 2. Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. / З.Е.Абезгауз, Х.Ю.Бейлькін, А.Р.Бухавец [і інш.]; пад рэд. В.П.Панюціча. – Мінск: Бел. навука, 2002. – 552 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ